мастацтваў, дзіцячыя яслі-сад. Мясцовая ўчастковая бальніца лічыцца адной з лепшых у рэспубліцы.

Згодна з дзяржаўнай праграмай адраджэння і развіцця сяла на 2005-2010 гг., у канцы 2007 г. вёска Дзераўная стала аграгарадком. Аграгарадок – гэта якасна новы тып сельскага пасёлка, у якім прадугледжваецца стварэнне вытворчай і сацыяльнай інфраструктур для забеспячэння насельніцтва, якое там пражывае, сацыяльнымі стандартамі.

Сёння тут пражывае звыш 1500 чалавек. Для іх паслуг адрамантаваны КБА, сельскі Дом культуры, тры прадуктовыя і адзін гаспадарчы магазіны. Змены адбыліся ў знешнім выглядзе аддзялення сувязі, школы мастацтваў, дзіцячага сада, спартыўнай школы, ашчаднай касы, бальніцы, аптэкі, стадыёна. Поўнасцю заменена абсталяванне тэлефоннай станцыі. Пракладзены новы цэнтральны водаправод і заасфальтаваны ўсе вуліцы.

Хацелася б, каб гэта кропелька гісторыі аграгарадка Дзераўная засталася з вамі, і каб у вандроўках па Беларусі вы ніколі не забывалі свае родныя мясціны і вярталіся на сваю малую радзіму.

ЛІТАРАТУРА

1. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Стаўбцоўскага раёна. – Менск: БелЭН, 2004. – 831 с.

УДК 94"1943" (476.4)

Студ. Ю.А. Яхімовіч

Навук. кір. дац. В.М. Астрога

(кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ)

## МАКАЎЕ – АХВЯРА АПЕРАЦЫІ "ФРАНЦ"

У гісторыі кожнага краю ёсць свае славутыя і трагічныя старонкі. З самага дзяцінства я ведаю, што Лядзенская зямля (месца, дзе жыве мая бабуля) ў гады Вялікай Айчыннай вайны была сапраўдным партызанскім краем. Восенню 1942 г. у лясах былі размешчаны значныя сілы партызан. 20 кастрычніка 1942 г. была створана партызанкая брыгада "За Радзіму", якую узначаліў А.К. Флегантаў. Дзейнічалі і атрады В.А. Ціхамірава і В.І. Лівенцава, якія праводзілі баявыя аперацыі на шашэйных дарогах і чыгунках, знішчалі гітлераўцаў, ваенную тэхніку, ваенныя эшэлоны.

Для барацьбы супраць партызан краю фашысты спланавалі карную экспедыцыю, якой далі назку аперацыя "Франц" (Franz). У час падрыхтоўкі да гэтай аперацыі з сярэдзіны жніўня 1942 г. у Чэрвеньскім,

Асіповіцкі і Бярэзінскім раёнах праводзіў разведку асобы батальён СС Дзірлевангера. Мэта аперацыі “Франц” заключалася ў тым, каб хутка акружыць сілы партызан і хуткім ударам знішчыць іх. Для гэтага былі сфарміраваны баявыя групы “Поўнач” і “Поўдзень”. Для правядзення аперацыі прыцягваліся сілы вышэйшага начальніка СС і нямецкай паліцыі армій “Цэнтр”, ахоўныя і франтавыя часткі вермахта. З 3 па 5 студзеня вораг вёў актыўную разведку, а ў ноч на 6 студзеня перайшоў да актыўных дзеянняў. Пры падтрымцы артылерыі і кулямёта немцы пачалі наступленне з Лапіч. Каля 7 гадзін раніцы немцы занялі в. Каменічы, выбіўшы адтуль ахоўную групу атрада Караля [1, с. 608].

Цэнтрам збору партызанскіх атрадаў стаў раён вёскі Макаўе. Лясы, сярод якіх яна знаходзілася, сталі месцам размяшчэння шматлікіх партызанскіх атрадаў, а потым і брыгад. Макаўе стала свайго рода сталіцай партызанскага краю. Жыхары вёскі пеклі для партызан хлеб, рамантавалі адзенне і абутак, аказвалі любую пасільную дапамогу.

Разведка партызан шукала выйсце з акружэння, аднак усюды натыкалася на варожыя заставы. Разведчыкам усе ж удалося ўстанавіць найболь слабае месца немцаў – вузкі ўчастак забалочанага лесу паміж в.Трохгранны Дуб і Лядецкае. На гэтым участку і было вырашана прарывацца. Узначаліў групу прарыву камандзір В. Лівенцаў. Фарсіраваўшы раку Беразіну, патрызаны выйшлі ў Клічаўскія і Бярэзінскія лясы. Разам з імі з блакады выйшлі больш тысячы мірных жыхароў, якія былі выратаваны ад карнікаў

Фашысты, раззлаваныя правалам сваёй карнай аперацыі, пачалі расправу з мірным насельніцтвам. “Гэта была наша партызанская вёска, дзе кожны другі, практычна ўсе, хто мог насіць зброю, змагаўся ў партызанскіх атрадах. Дома заставаліся толькі жанчыны, дзеці, старыкі” – так успамінаў пра Макаўе адзін з самых вядомых партызанскіх камандзіраў, Герой Савецкага Саюза В. Лівенцаў [2, с. 169]. На вуліцы вёскі адбыўся апошні мітынг партызан, пасля якога яны накіраваліся на прарыў. Частка жыхароў вёскі пайшла разам з імі. Як сведчаць успаміны былой жыхаркі вёскі Лявіцкай Н. Я. ў лесе яны правялі ўсю ноч. Але паколькі быў вельмі моцны мароз, на наступны дзень усе вярнуліся ў вёску. Але ў гэты дзень, 8 студзеня, у вёску прыйшлі і карнікі. Гэта быў карны спецатрад СС Дзірлевангера. Ужо, падыходзячы да вёскі, карнікі прачэсваюць лес. На краі вёскі знаходзіўся драўляны зруб новага дома лясніка. Сюды пачалі зганяць і растрэльваць жыхароў вёскі. Зруб быў абкладзены саломай і падпалены. У полымі згарэлі амаль усе жыхары вёскі. 9 студзеня карнікі спалілі ўсе астатнія дамы вёскі. Ахвярамі сталі 229 чалавек. У спісах загінуўшых жыхароў вёскі Макаўе прыводзяцца звесткі толькі пра 75 чалавек. Але і гэтыя няпоўныя спісы даюць нам

уяўленне аб загінуўшых. Яны насілі прозвішчы, якія і зараз шырока вядомы ў нашым краі: Блізнец, Вернікоўскія, Ваўчкі, Гурэнчыкі, Дабрыцкія, Кубары, Кедычы, Кавецкія, Лапаткі, Мурачы, Паўловічы, Рымашэўскія, Сакалоўскія, Сёмкіны.

У ходзе аперацыі "Франц" карнікі занялі ўсе вёскі нашага краю. У многіх з іх яны распраўляліся з мірным насельніцтвам, помсцячы людзям за дапамогу партызанам. У спісу гэтых вёсак Старыя і Новыя Ляды, Тадулічы, Курганок, Старыя Рэчкі, Трохгранны Дуб, Пятроўка, Кобзевічы. У сярэдзіне студзеня карная аперацыя "Франц" закончылася. У час яе фашысты расстралялі, павесілі і спалілі жывымі 2025 савецкіх грамадзян, спалілі поўнасцю або часткова 20 вёсак [3, с.46]. Фашысцкія акупанты агнём і мячом, шыбеніцамі і карнымі аперацыямі імкнуліся скарыць беларускі народ. Але наш народ не скарыўся перад магутнасцю нямецкай ваеннай машыны, выстаяў і перамог. Барацьба беларускіх партызан і падпольшчыкаў, супраціўленне насельніцтва не мела аналагаў у свеце. Памяць пра ахвяры, памяць пра загінуўшых. Памяць пра герояў, якія зрабілі ўсё для нашай свабоды, заўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

ЛІТАРАТУРА


1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945: Энцыкл./ Белорус. Сав. Энцыклапедыя; Рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск, 1990. – 680 с.
2. Ливенцев, В.И. Партизанский край/ В.И. Ливенцев. – Минск, 1969. – 214 с.
3. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Чэрвеньскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2000. – 623 с.


УДК 93/94


Студ. Т.Д. Маскальков
Научн. рук. доц. И.М.Рыжанков
(кафедра истории Беларуси и политологии, БГТУ)


## В ПАМЯТЬ О БОЕВОМ ПУТИ МОСКАЛЬКОВА КУЗЬМЫ ОЛИМПОВИЧА

Автор публикации осветил этапы военной службы в рядах Красной Армии прадеда – Москалькова Кузьмы Олимповича в годы Великой Отечественной войны.

Москальков Кузьма Олимпович родился в 1913 г. в д. Белевичи Могилевского района. С началом Великой Отечественной войны был при-